# Па старонках гісторыі дваранскіх крэдытна-фінансавых арганізацый

Ігар МЕЛЬНІКАЎ



Гісторык,
магістр Варшаўскага ўніверсітэта

Свой папярэдні артыкул аўтар прысвяціў асвятленню гісторыі развіцця і дзейнасці Мінскага сельскагаспадарчага таварыства[1]. Безумоўна, мінскае дваранства было адным з найбольш актыўных на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю Расійскай Імперыі. Аднак і ў іншых губернях, што ўваходзілі ў склад гэтай адміністрацыйнай адзінкі, шляхта таксама праявіла зацікаўленасць да страхавой і крэдытна-фінансавай сфер. Цэнтрамі дваранскай эканамічнай дзейнасці сталі сельскагаспадарчыя таварыствы [1, с. 151].

Увогуле першае сельскагаспадарчае таварыства на тэрыторыі Беларуска-Літоўскага краю з'явілася ўвесну 1876 г. у Віцебску. Царскія ўлады зацвердзілі спецыяльны статут гэтай арганізацыі 28 ліпеня таго ж года. Яе члены павінны былі плаціць уступны ўзнос 5 рублёў і такую ж суму гадавога ўзносу. Старшыня і члены праўлення выбіраліся на агульным сходзе тайным галасаваннем на некалькі гадоў [2, с. 265].

Першым старшынёй Віцебскага сельскагаспадарчага таварыства быў А. Свалінскі, а віцэ-старшынёй — граф А. Аскерка. Афіцыйным патронам таварыства 1 мая 1878 г. стаў вялікі князь Уладзімір Аляксандравіч. У 1880 г. па ініцыятыве былога віцебскага губернатара П. Растоўцава таварыства атрымала ад Губернскай управы па сялянскіх пытаннях суму ў 13 тыс. рублёў для арганізацыі сельскагаспадарчай школы [3]. Названае таварыства ў 1882 г. арганізоўвае дзве сельскагаспадарчыя выставы: у Дрысе і непасрэдна ў Віцебску. Галоўнай мэтай гэтых выстаў было знаёмства землеўласнікаў з новымі гатункамі збожжа і сучаснымі відамі мінеральнага ўгнаення [4].

Разам з гэтым кіраўніцтва Віцебскага сельскагаспадарчага таварыства разумела неабходнасць стварэння крэдытна-фінансавай установы, якая б дапамагла эканамічнаму развіццю Віцебскай губерні. У 1879 г. было створана Таварыства ўзаемнага крэдытавання землеўласнікаў, а ўжо 16 верасня 1880 г. яго статут быў зацверджаны міністрам фінансаў [5]. Акрамя функцыі крэдытавання таварыства мела права на прыём закладных вэксаляў, а таксама скупкі іншых каштоўных папер. Віцебскае таварыства ўзаемнага крэдытавання вельмі пасяпхова супрацоўнічала з філіялам Дзяржаўнага банка ў Смаленску, з Гандлёвым банкам у Рызе, а таксама са Смаленскім таварыствам узаемнага крэдытавання [6, с. 1].

Пачатковы капітал Таварыства ўзаемнага крэдытавання землеўласнікаў Віцебскай губерні складаў 11 385 рублёў, але праз тры гады ён ужо перавышаў 91 574 рублі, а колькасць членаў павялічылася з 93 у 1879 г. да 551 у 1882 г. Пікам развіцця таварыства лічыцца 1900 г., час, калі яго статутны фонд складаў 135 000 рублёў, а колькасць членаў — 670 чалавек [7].

Даход таварыства ў 1880 г. складаў 9 тыс. рублёў, у 1882 г. — 20 157 рублёў, у 1889 г. — 15 500, у 1893 г. — 18 000, у 1899 г. і ў 1900 г. — 15 000 рублёў [8, с. 698]. Штогод 5% ад даходу прызначалася на стварэнне аграномічнай школы. Першым старшынёй праўлення таварыства быў Х. Абранпальскі, а яго намеснікам — М. Пачобут. У 1903 г. старшынёй праўлення гэтай крэдытна-фінансавай установы стаў М. Рык [2, с. 269].

Яшчэ адным праектам віцебскіх землеўласнікаў была ідэя стварэння Таварыства ўзаемнага сельскагаспадарчага страхавання. Ужо былі распрацаваны статут гэтай арганізацыі, нават пачаліся тэхнічныя работы. Аднак у 1885 г. царская адміністрацыя забараніла яе стварэнне, абгрунтоўваючы сваё рашэнне тым, што ў рэгіёне ўжо дзейнічае сялянскае таварыства ўзаемнага страхавання. Землеўласнікі пісалі лісты да царскіх чыноўнікаў, у якіх спрабавалі абгрунтаваць неабходнасць стварэння менавіта шляхецкай арганізацыі. У адным з такіх лістоў увага звярталася на тое, што ў Сялянскім таварыстве страхавыя стаўкі вельмі нізкія, а зроблена гэта было спецыяльна для сялян.

[1] *Банкаўскі веснік. 2011. № 16.*

Такія ўмовы страхавання не падыходзілі буйным шляхецкім гаспадаркам [9]. Аднак гэтыя аргументы не былі пачуты, і Таварыства ўзаемнага сельскагаспадарчага страхавання ў Віцебскай губерні так і не стварылі.

Ідэя заснаваць крэдытна-фінансавую ўстанову была і ў кіраўніцтва Віленскага сельскагаспадарчага таварыства. Гэтая арганізацыя была створана ў 1884 г., а першым на пасаду старшыні праўлення прызначылі графа Яна Тышкевіча. У верасні 1885 г. таварыства арганізавала першую выставу коней, кароў і авечак. У ёй узялі ўдзел землеўласнікі з Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў [10].

Трэба ўлічваць тое, што кіраўніцтва Віленскага банка (І. Мантвіл) ад самага пачатку стварэння Віленскага сельскагаспадарчага таварыства спрабавала падпарадкаваць названую арганізацыю да свайго банка. Гэтаму супрацьстаяў адзін з дзеячаў сельскагаспадарчага таварыства Іпаліт Корвін-Мілеўскі, у якога былі свае рахункі з крэдытнай установай. Яшчэ на пачатку 1880-х гг. старэйшы брат Іпаліта Корвін-Мілеўскага Ігнацій абвінаваціў Віленскі банк у дзейнасці, якая наносіць шкоду акцыянерам. У Кракаве ім быў выдадзены інфармацыйны буклет “Адкрыты ліст да акцыянераў Віленскага земскага банка”, у якім беларускі дваранін дамагаўся павелічэння дывідэндаў акцыянерам банка за кошт заробкаў кіраўніцтва крэдытнай установы [11]. У сваю чаргу, Іпаліт Корвін-Мілеўскі таксама выступаў за павелічэнне сумы дывідэндаў. Ён фінансаваў газету “Северо-Западное слово” і “замаўляў” яе рэдактару артыкулы, накіраваныя супраць Віленскага банка [12, с. 139].

У 1902 г. Іпаліт Корвін-Мілеўскі распачынае новую фазу “вайны” з банкам. Ён выступае з ідэяй стварэння Таварыства ўзаемнага крэдыту для землеўласнікаў у структуры Віленскага сельскагаспадарчага таварыства і падспраўздачнасці яму [13, с. 6]. Калі б гэта ідэя атрымала развіццё, быў бы створаны неблагі канкурэнт для крэдытна-фінансавага манапаліста ў губерні, якім быў Віленскі банк. Аднак падначаленыя І. Мантвіла паспрыялі таму, каб і гэта ідэя І. Мілеўскага не атрымала падтрымкі.

Праз два гады І. Корвін-Мілеўскі арганізоўвае Саюз банкаўскіх даўжнікоў. У сваіх тагачасных публікацыях ён абвінавачваў Віленскі банк у падтрымцы русіфікацыі Паўночна-Заходняга краю [14, с. 147]. Дарэчы, дапамагчы даўжнікам Віленскага банка спрабавала Мінскае сельскагаспадарчае таварыства. Дзейнасць, накіраваная на рэструктурызацыю запазычанасці землеўласнікаў, ажыццяўлялася ў 1893 г., 1898 г. і 1902 г.

На пачатку XX ст. назіраецца развіццё ашчадных кас, якія ствараліся пры сельскагаспадарчых таварыствах. У Віленскай губерні ў 1901 г. працавала 9 такіх кас, у Гродзенскай — 5, Мінскай — 16, Віцебскай — 8, у Ковенскай, якая таксама ўваходзіла ў склад Паўночна-Заходняга краю Расійскай Імперыі, было 33 ашчадныя касы. Агульная сума ўкладаў у касах усіх пяці беларуска-літоўскіх губерняў складала 3 млн. 659 тыс. рублёў [15]. Асноўнай мэтай ашчадных кас было стварэнне ўмоў дзеля збліжэння землеўласнікаў і ніжэйшых слаёў насельніцтва: дробнай шляхты і сялянства. Гэтую функцыю з поспехам выконвалі, напрыклад, ашчадныя касы ў Клецку і Парэччы.

Такім чынам, можна ўпэўнена казаць пра тое, што дзейнасць беларускіх землеўласнікаў Паўночна-Заходняга краю Расійскай Імперыі спрыяла развіццю эканомікі не толькі заходняга краю, але і ўсёй імперыі Раманавых. Крэдытна-фінансавыя і страхавыя арганізацыі, створаныя беларускімі дваранамі, з аднаго боку, былі праявай асноўнага пастулату літоўскага пазітывізму, а менавіта “арганічнай працай ад пачаткаў”, а з іншага — фарміравалі ўмовы для больш хуткага пераходу эканомікі Расійскай Імперыі ад феадалізму да капіталізму.

***Літаратура:***

1. *Мельнікаў, І. “Польскае” пытанне ў палітыцы царскіх улад пасля падаўлення паўстання 1863—1864 гг. / І. Мельнікаў // Проблемы экономики и управления : сб. науч. ст. по материалам науч.-практ. конф. студентов и преподавателей, Минск, 28—29 апр. 2003 г. / Част. ин-т упр. и предпринимательства; под общ. ред. А.Е. Михневича. — Минск, 2003. — С. 151.*
2. *Jurkowski, R. Ziemiaństwo polskie Kresów Północno-Wschodnich 1864—1904: działalność społeczno-gospodarcza / R. Jurkowski. — Warszawa: Przegląd Wsch., 2001. — 603 s.*
3. *Mienicki, W. Walne zebranie Witebskiego Tow. Rolniczego// Kraj. — № 11. — 11(23).03.1884.*
4. *Rusticus, J.W. Stowarzyszenie ziemian witebskich // Kurier Warszawski. — № 220. — 15 (27).07.1883.*
5. *Mienicki, W. Towarzystwo Wzajemnego Kredytu Ziemian Gubernii Witebskiej // Kraj. — № 15. — 13(25). 04.1890.*
6. *Отчет о действиях Общества взаимного кредита землевладельцев Витебской губернии за 1893 год. — Витебск, 1894. — С. 39.*
7. *Z Witebska // Kraj. — № 18. — 05(18).05.1900.*
8. *Jurkowski, R. Praca organiczna, czy tylko trwanie? Przyczynek do dziejów towarzystw rolniczych i organizacji gospodarczo-społecznych ziemiaństwa polskiego na kresach Północno-Wschodnich w latach 1876—1904 / R. Jurkowski // Przegląd Wsch. — 2000. — R. 6, z. 4. — S. 693—737.*
9. *Z Witebska // Kraj. — № 26. — 30.06 (12.07). 1894.*
10. *Z Wilna // Kraj. — № 40. — 6(18).10.1885.*
11. *Wilczyński, S. Korespondencja z Wilna // Kraj.— № 14. — 6(18).04.1886.*
12. *Korwin-Milewski, H. Siedemdziesiąt lat wspomnień 1855—1925/ H. Korwin-Milewski. — Poznań, 1930. — 350 s.*
13. *Журнал общего собрания членов Виленского общества сельского хозяйства. — Вильно, 1903 г. — С. 53.*
14. *Szwarc, A., Wieczorkiewicz, P. Bracia Korwin-Milewscy — patrioci czy apostaci // Francja — Polska XVIII — XIX w. Studia poświęcone Profesorowi Andrzejowi Zahorskiemu w sześćdziesiątą rocznicę urodzin. — Warszawa, 1987. — С. 142—162.*
15. *Towarzyswo pozyczkowo-oszczędnosciowe na Litwie // Kraj. — № 40. — 3(16).10.1903.*